**Шычко С.**

## "ЗА КЛОПАТ ПРА РАДЗІМУ"

Зорка ганаровага грамадзяніна Магілёва – у гонар беларускага і расійскага пісьменніка.

Валерыя Казакова добра ведаюць у Беларусі. Ураджэнец Магілёўшчыны, большую частку свайго жыцця ён звязаў з Расіяй. Вайсковец, журналіст, вучоны-сацыёлаг, работнік Адміністрацыі прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, паэт і празаік – на ўсіх пасадах, ва ўсіх сваіх сацыяльных і творчых статусах ён апекаваўся і апякуецца клопатамі пра сваю радзіму, пра тыя мясціны, што вывелі яго ў шырокі свет. Як адзнака такой руплівасці земляка – наданне яму звання ганаровага грамадзяніна Магілёва.

Дарэчы, гораду, яго ваколіцам, людзям Магілёва і Магілёўшчыны прысвечана і адна з кніг Валерыя Казакова – "Горад, які заўсёды са мной". Выдадзена яна ў Беларусі – у Выдавецкім доме "Звязда". На свяце горада 29 чэрвеня расійскаму і беларускаму літаратару не толькі ўручаць пасведчанне, але яшчэ і адкрыюць імянную зорку ў гонар пісьменніка і мецэната на плошчы Зорак.

Валерый Мікалаевіч Казакоў зрабіў нямала добрых спраў дзеля захавання гісторыка-асветніцкіх традыцый, прыняў асабісты ўдзел у збіранні і набыцці для Магілёўскага абласнога гістарычнага музея многіх беларускіх артэфактаў. Кнігі нашага земляка на рускай, беларускай, у перакладзе на іншыя мовы выдадзены ў Беларусі і Расіі, Польшчы і Чарнагорыі, Сербіі і іншых краінах свету. Асаблівы розгалас займеў нядаўна выдадзены раман "Чорны кот" (Мінск, "Харвест"), у якім спалучыліся гісторыя і сучаснасць. Раман настолькі рэльефны і дынамічны праз вобразы, мастацкія дзеі, за якімі стаяць рэальныя жыццёвыя калізіі, што варта было б айчыннаму кінематографу звярнуць на яго сур’ёзную ўвагу.

Яшчэ раней за пісьменніцкую і грамадскую дзейнасць Валерый Казакоў, які з'яўляецца і старшынёю ФНКА "Беларусы Расіі", быў узнагароджаны медалём ФранцыскаСкарыны.

***Шычко, С. За клопат пра радзіму : [пісьменніку Валерыю Казакову будзе ўсталявана зорка ганаровага грамадзяніна Магілёва] / Сяргей Шычко // Звязда. — 2018. — 27 чэрвеня. — С. 3.***